УДК 37(476.4)"18/19"

**А. Агееў**, канд. іст. наук
Могильовський державний університет імені А.О. Кульшова
(Магілёў, Беларусь)

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ СІСТЭМЫ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ КАЛАНІЯЛЬНАЙ ЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ АД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

*У дадзеным артыкуле разглядаецца прававое рэгуляванне ў сферы школьнай адукацыі Магілёўскай губерні як адлюставанне яе каланіяльнай залежнасці. Аналіз прававых дакументаў паказвае, што на Магілёўшчыне у XIX - пачатку XX стст. рэгулявалі дзейнасць школьных навучальных устаноў не агульнарасійскія, а за малым выключэннем асобныя палажэнні. Гэта было выклікана тымі вялікімі адрозніваннямі, які мелі беларускія губерні ў параўнанні з велікарускімі, нежаданнем даваць мясцовым элітам такія ж правы, як выхадцам з расійскіх рэгіёнаў, жаданнем праводзіць праз сферу адукацыі русіфікацыю краю. Прававыя акты стваралі менш спрыяльныя ўмовы і абмяжоўвалі магчымасці развіцця адукацыі ў губерні. У выніку адна з самых адукаваных ў Расіі губерняў праз стагоддзе страціла свае перадавыя пазіцыі ў еўрапейскай частцы імперыі. і толькі калі расійскія ўлады далі абмежаныя магчымасці самакіравання ў выглядзе земстваў, працэс развіцця школьнай сеткі адразу паскорыўся. Каланіяльная залежнасць, нераўнапраўе Магілёўскай губерні ў сферы адукацыі не выклікае сумненняў.*

***Ключавыя словы:*** *Магілёўская губерня, Беларусь, Украіна, Расійская імперыя, калонія, каланяільныя ўскраіны, школа, адукацыя, прававое рэгуляванне.*

**Агеєв А., 2017**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ці была Украіна калоніяй у Расійскай імперыі – такое ж важкае пытанне для ўкраінцаў, як для беларусаў пытанне – ці ж была Беларусь калоніяй Расіі! Хаця насамрэч не менш, а можа і больш істотнае гэтае пытанне для расіян, якім даўно пара б было разабрацца з заваламі сваёй імперскай гісторыі і зразумець самакаштоўнасць уласнай краіны, неабходнасць добраўпарадкавання ўласных зямель. Прызнанне наяўнасці калоній у гістарычным мінулым моцна паспрыяла б гэтаму.

Цяжкасць набліжэння да ісціны зключаецца ў тым, што адной з асаблівасцяў Расійскай каланіяльнай імперыі было тое, што яна мела адзіную тэрыторыю, у адрозненні ад еўрапейскіх каланіяльных імперый, дзе метраполію і калоніі раздзялялі вялікія адлегласці, а іх геаграфічная адасобленасць была відавочнай. Для параўнання адзначым, што падобнай была сітуацыя ў Аўстра-Венгрыі, але там пануючыя класы разглядалі Боснію, Галічыну, Славакію і іншыя славянскія ўскраіны як калоніі.

У дадзеным артыкуле разглядаецца сітуацыя ў сферы школьнай адукацыі Магілёўскай губерні, а канкрэтна яе прававое рэгуляванне, якое, як нам уяўляецца, адлюстроўвае больш шырокія заканамернасці. Калі сыходзіць з агульнапрынятых уяўленняў аб узаемаадносінах метраполій і іх калоній, то звычайна ў калоніях дзейнічала асобае прававое рэгуляванне, хаця і заснаванае на нацыянальнай сістэме права. Каланіяльныя тэрыторыі не мелі самастойнай палітычнай і эканамічнай улады, кіраваліся на аснове асаблівага рэжыму. Таму найбольш істотнымі для нас з'яўляюцца пытанні: ці дзейнічалі на тэрыторыі губерні агульнарасійскія прававыя акты і ці знаходзілася губерня ў роўных умовах з велікарускімі губернямі ў галіне школьнай адукацыі?

Удзельнічаючы ў 2012 г. у праекце напісання абагульняючай гісторыі адукацыі Магілёўскай вобласці аўтар артыкула звярнуў ўвагу на спецыяльныя нарматыўныя акты, якія рэгулявалі дзейнасць устаноў адукацыі ў краі. Яны відавочна адрозніваліся ад палажэнняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі велікарускіх губерняў. А колькасць спецыльных палажэнняў, статутаў, нават з улікам неабходнасці ўлічваць асаблівасці ўсіх рэгіёнаў другой па тэрыторыі імперыі свету, пераўзыходзіла нармальную, калі сыходзіць з таго, што Магілёўская губерня была б стандартнай раўнапраўнай часткай Расіі. Заўважаная асаблівасць падалася істотнай і маючай значэнне не толькі для сферы адукацыі і стала штуршком для аналізу сітуацыі.

У 1772 г. пасля гвалтоўнага першага падзелу Рэчы Паспалітай прыдняпроўскія землі Беларусі былі далучаны да Расійскай імперыі, і была ўтворана Магілёўская губерня. Царызм прыняў у свой склад дастаткова развітыя ў эканамічным і культурным дачыненні землі. Высокую для таго часу адукаванасць мела шляхта, духавенства, мяшчане. Маладыя людзі з забяспечаных сем'яў часта атрымлівалі адукацыю ў Еўропе. Школы рэгіёну належалі пераважна каталіцкай і праваслаўнай цэрквам. Беларуская рыма-каталіцкая епархія з цэнтрам у Магілёве, межы якой супадалі з межамі Расійскай імперыі, мела не толькі семінарыю, але і акадэмію, якія (семінарыя з 1847 г., акадэмія з 1882 г.) размяшчаліся ў Санкт-Пецярбургу, але называліся "магілёўскімі" да 1918 г. Працягвала дзейнічаць Магілёўская духоўная праваслаўная семінарыя. У Магілёве, Мсціславе, Гомелі і Оршы дзейнічалі павятовыя духоўныя вучэльні. Хедары дзейнічалі ва ўсіх кагалах і прыкагалках [1, с. 57-58]. Усе асноўныя канфесіі ў канцы XVIII ст. мелі свае сістэмы адукацыі.

Старая багаслоўская царкоўная сістэма навучання ўжо не адпавядала патрэбам часу. Але ў Расіі работа па образованію свецкай сістэмы образованія пачала праводзіцца толькі з 1786 г., калі Кацярынай II быў зацверджаны "Статут народных вучылішчаў у Расійскай імперыі", якім былі закладзены асновы расійскай народнай адукацыі. Магілёўскае галоўнае народнае вучылішча было адкрыта ў 1789 г. На мяжы XVIII–XIX стст. сетка навучальных устаноў заставалася слаба развітай і вельмі неаднароднай. Большасць школ была створана яшчэ ў Рэчы Паспалітай.

Рэформа адукацыі, неабходнасць якой у Расеі даўно наспела, была праведзена ў пачатку XIX ст. Аляксандр I зацвердзіў у 1803 г. "Папярэднія правілы народнай асветы", а ў 1804 г. выйшаў "Статут навучальных устаноў", які прадугледжваў стварэнне адзінай бессаслоўнай сістэмы агульнаадукацыйных школ. Але на Віленскую навучальную акругу дзеянне новага статута не распаўсюджвалася, а навучальныя ўстановы Магілёўскай, як і астатніх беларускіх губерняў ўваходзілі менавіта ў яе склад. Фармальна Віленскі ўніверсітэт, як і Дерпскі, Абоскі, а пазней і Варшаўскі лічыліся замежнымі ўніверсітэтамі на тэрыторыі Расійскай імперыі [3, с. 268]. Па прапанове Міністэрства народнай асветы кіраўніцтва ўніверсітэта і акругі ў 1803 г. распрацавалі асобны "Статут або агульныя пастановы імператарскага Віленскага ўніверсітэта і вучэльняў яго акругі". Дакумент ў пэўным сэнсе з'яўляўся саступкай насельніцтву тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Статут накіроўваў усю дзейнасць школы на ўмацаванне асноў "праваслаўя, самадзяржаўя і народнасці" [7, с. 34].

У пачатку правядзення рэформы ў Магілёўскай губерні, якая складааса з 12 паветаў, было толькі 8 вучэльняў. Па новым Статуце пачалі ствараццa павятовыя вучылішчы і гімназіі: у 1809 г. адкрылася гімназія ў Магілёве, пазней былі адкрыты павятовыя вучылішчы ў Касцюковічах, Мсціславе, Магілёве, Чэрыкаве, Чавусах, прыходскія вучылішчы [6, с. 938]. У 1828 г. пры Мікалаю I прымаецца больш рэакцыйны "Статут гімназій і вучылішчаў павятовых і парафіяльных", які дзейнічаў да 1863 г. Ён захаваў тыпы навучальных устаноў, але ліквідаваў іх пераемнасць. Пачынае дзейнічаць саслоўны прынцып адукацыі. Палітыка "абрусення", якую распачаў рускі ўрад пасля падаўлення паўстання 1830-31 гг., у галіне народнай адукацыі мела на мэце ўзмацненне рускага ўплыву.

Красамоўнымі з'яўляюцца і спробы адміністрацыйнага далучэння Магілёўскай губерні да велікарускай навучальнай акругі. У 1826 г. навучальныя ўстановы Віцебскай і Магілёўскай губерняў перадалі С.-Пецярбургскай навучальнай акрузе. Далучэнне да велікарускай навучальнай прасторы было настолькі штучным, што ўжо праз тры гады ў 1829 г. была створана Беларуская навучальная акруга, якой падпарадкавалі навучальныя ўстановы Віцебскай і Магілёўскай губерняў, а ў 1831-32 гг. і іншых губерняў былой Віленскай акругі. Беларуская акруга праіснавала да 1850 г. У гэтым жа годзе школы Магілёўскай губерні былі зноў далучаны да С.-Пецярбургскай ўніверсітэцкай акругі. Але практыка кіравання паказала ненатуральнасць такога падпарадкавання, і ў 1864 г. Магілёўская і Віцебская губерні былі канчаткова ўключаны ў Віленскую навучальную акругу.

Школьная рэформа 60-х гадоў XIX ст.. праходзіла ў Беларусі пад асабліва строгім кантролем царскага ўрада. Звязана гэта было з рэакцыйнай палітыкай царызму ў краі пасля падаўлення паўстання 1863-64 гг. У Літве, Беларусі і правабярэжнай Украіне быў усталяваны жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым. Увесь край быў абвешчаны на ваенным становішчы. Пачынаецца новая кампанія ўзмацнення палітыкі "русіфікацыі адукацыі" і "адраджэння рускай справы". Былі ліквідаваныя дваранскія вучылішчы, у якіх займаліся

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пераважна дзеці шляхты. Адкрываліся толькі рускія школы, а заснаванне беларускіх забаранялася. Горы-Горацкі земляробчы інстытут у 1864 г. быў пераведзены ў С. Пецярбург. Прагрэсіўнае для таго часу "Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах" 1864 г., на губерні Беларусі не распаўсюджвалася. Для Віленскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў у сакавіку 1863 г. былі зацверджаны "Часовыя правілы для народных школ". Сфера народнай адукацыі апынулася цалкам падкантрольная адміністрацыі і ўраду [5, с. 59-61].

У адпаведнасці з "Часовымі правіламі" Магілёўская дырэкцыя народных вучылішч была заснаваная ў сакавіку 1863 г. [6, с. 910]. У 1864-65 гг. у распараджэнне дырэкцый перайшлі парафіяльныя вучылішчы, ў 1867 г. – школы, якія раней падпарадкоўваліся Міністэрству грамадзянскай маёмасці, у 1868 г. – пачатковыя вучылішчы пры лютэранскіх і рэфармацкіх цэрквах [2, с. 231].

З-за палітычных і нацыянальных абмежаванняў у краі вынікі рэформы 1864 г. былі больш сціплымі ў параўнанні з Расіяй. Нягледзячы на рост школьных навучальных устаноў у губерні ў 1869 г. з 204 валасцей навучальныя ўстановы існавалі толькі ў 38 [4, с. 179]. Земская рэформа 1864 г., якая ажыццяўляецца ў 34 губернях еўрапейскай часткі Расіі, не праводзілася на тэрыторыі Беларусі. У адрозненне ад велікарускіх губерняў Расіі ў Беларусі не існавала земскіх школ і грамадскасць не дапускалася да кіравання народнай адукацыяй.

Меры, прынятыя ў 1860-х гг. расійскімі і мясцовымі ўладамі супраць панавання ў гімназіях Беларусі "польскага элемента", шмат у чым дублявалі палітыку 1830 гг., толькі праводзіліся больш настойліва. Усе выкладанне павінна было весціся выключна на расейскай мове. Настаўнікі-каталікі ў 1864 г. былі звольненыя, а на іх месца прызначаліся настаўнікі праваслаўнага веравызнання, якіх імкнуліся падбіраць з "унутраных губерняў" (велікарускіх – аўт.). З мэтай прыцягнення чыноўнікаў, духавенства і настаўнікаў з "цэнтральнай Расіі" для іх былі ўсталяваныя розныя ільготы, у тым ліку 50 % грашовыя надбаўкі да акладаў. Нават мясцовыя праваслаўныя кандыдаты ў настаўнікі праходзілі дбайную праверку на добранадзейнасць [5, с. 60].

Царскім урадам ігнараваліся нацыянальныя інтарэсы не толькі польскамоўнага насельніцтва, але і беларускамоўнага. Пытанне аб вывучэнні беларускай мовы або выкладанне прадметаў на беларускай мове ў навучальных установах Беларусі Міністэрствам народнай асветы нават не разглядалася, нягледзячы на тое, што беларуская мова была найбольш распаўсюджанай у губерні. У 60-х гадах XIX ст.. расійскія ўлады пайшлі на некаторыя нязначныя саступкі "беларускай гаворцы" рэкамендаваўшы настаўнікам "пры тлумачэнні незразумелых слоў карыстацца роднай беларускай мовай народа". Але ў студзені 1864 г. па распараджэнню міністэрства адукацыі ў сценах навучальных устаноў забаранялася размаўляць на родных мовах: беларускай, польскай, яўрэйскай і інш. Дазвалялася гаварыць, нават на перапынках, толькі на рускай мове. У 1867 г. адмысловым указам было забаронена друкаванне кніжак на беларускай мове. Такая палітыка паслядоўна праводзілася доўгія гады [1, с. 62-63].

А вось цэркоўнапрыхадскія школы кіраваліся імперскімі заканадаўчымі актамі. У 1884 г. былі выдадзены "Правілы аб царкоўна-прыходскіх школах". Знаходзіліся яны ў падпарадкаванні духоўнага ведамства. Згодна "Правілаў", у 1885 г. Сінод зацвердзіў адзіныя праграмы і навучальны план. Навучанне ажыццяўлялася толькі на рускай мове. Практычна ніякіх звестак пра родны край, "аб роднай беларускай мове" не паведамлялася. Аб вывучэнні гісторыі Беларусі як дзяржавы не вялося гаворкі. Размова ішла толькі пра Паўночна-Заходні край і заходнія губерні Расіі. Такім чынам, пачатковыя школы былі аддадзены пад контроль праваслаўнага духавенства, чыноўнікаў і паліцыі [5, с. 75-78].

Гімназіі па статуту 1864 г. аб'яўляліся бессаслоўнымі навучальнымі ўстановамі. Паводле статуту пачынаючы з 1865 г. калектыў Магілёўскай класічнай гімназіі пераходзіць на новыя праграмы, у Гомелі на базе трохкласная дваранскага вучылішча адкрываецца мужчынская прагімназія. У 1871 г. сярэдняя адукацыя зноў робіць крок назад – выдаецца больш рэакцыйны "Статут гімназій і прагімназій", які дзейнічаў з некаторымі зменамі да 1918 г. У 1872 г. ўпершыню былі зацверджаны агульнадзяржаўныя праграмы гімназіяў. Тады ж былі зацверджаны статуты шасцігадовых рэальных вучылішчаў, якія ўтвараліся замест рэальных гімназій. Трэцім ў Беларусі з'явілася ў 1885 г. вучылішча ў Магілёве. Такім чынам, гімназіі ў Магілёўскай губерні дзейнічалі па агульнарасійскім узорам і сталі самым эфектыўным ў сферы адукацыі сродкам русіфікацыі края.

Гарадскія вучылішчы былі школамі павышанага ўзроўню. Большая частка павятовых вучылішчаў, якія існавалі паводле статуту 1828 г, была ператворана ў 1870-х гг. у гарадскія вучылішчы па "Палажэнню" 1872 г. Гарадскія вучылішчы давалі найбольш высокі ўзровень пачатковай адукацыі [5, с. 68].

З агляду Магілёўскай губерні за 1895 г. бачна, што ў губерні было 2807 навучальных устаноў, у якіх вучылася 62 746 чалавек, у тым ліку 55 276 хлопчыкаў і 7470 дзяўчынак. Але ахоп навучаннем дзяцей школьнага ўзросту ў беларускіх губернях ўсё яшчэ быў невысокі і адставаў ад велікарускіх. Так калі ў сярэднім па губернях еўрапейскай Расіі на мяжы стагоддзяў навучалася 42 % дзяцей, то ў беларускіх вучылася толькі кожнае трэцяе дзіця. Рэакцыйная палітыка царызму ставіла нацыянальныя раёны ў горшае становішча, у параўнанні з метраполіяй [1, с. 66]. У 1904 годзе былі адменены абмежаванні адносна "мясцовых" моў у дзевяці заходніх губернях Расіі, але праблемы стварэння беларускамоўнай школы царызм так і не вырашыў [5, с. 87].

Шэраг рэформаў, якія правяў царскі ўрад у XIX ст., паклаў пачатак стварэнню сістэмы пачатковай і сярэдняй свецкай адукацыі. Тым не менш, Расія паранейшаму значна адставала ад еўрапейскіх краін па ўзроўні пісьменнасці насельніцтва. Усеагульны перапіс 1897 г. паказала, што толькі чвэрць насельніцтва Расіі была пісьменнай. У краінах Заходняй Еўропы адукаванасць насельніцтва складала каля 90%. Спрабуючы падняць ўзровень народнай адукацыі, урад Расіі з 1900 па 1914 павялічыў выдаткі на патрэбы Міністэрства народнай асветы ў 4,75 разы [1, с. 67].

Толькі Палажэнне 1903 г. "Аб кіраванні земскім гаспадаркай у губернях Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай" дало старт стварэнню губернскіх і павятовых камітэтаў па справах земскай гаспадаркі. Урадавым органам прадастаўлялася шырокая ўлада над земствамі. Крытыкі адзначалі, што гэтыя земствы ўяўлялі сабой карыкатуру на выбарчыя органы земскага самакіравання, паколькі замест выбарчага сходу і адпаведных упраў былі створаны губернскія і павятовыя камітэты. Толькі з 1911 г. ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях сталі ствараццa выбарныя земскія ўстановы па асобнай сістэме, якая давала перавагі рускай курыі.

У Магілёўскай губерні прыступілі да працы па пашырэнні сеткі земскіх народных школ ў 1905 г. Толькі за 1907 г. іх было ў губерні адкрыта 200. Да пачатку Пер-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шай сусветнай вайны на Магілёўшчыне колькасць навучальных устаноў рознай ведамаснай прыналежнасці, якія давалі пачатковую адукацыю, вырасла да 3360. Вялікі крок наперад у справе развіцця народнай адукацыі адбыўся, перш за ўсё, дзякуючы таму, што ўрад дэлегаваў на мясцовы ўзровень частку сваіх функцый. Нават ва ўмовах вайны земствы ставілі задачу пераходу да ўсеагульнай адукацыі ў Магілёўскай губерні [5, с. 80].

Наша спроба аналізу прававых дакументаў, якія рэгулявалі працу навучальных устаноў на Магілёўшчыне, паказвае, што за малым выключэннем, тут у XIX – пачатку XX стст. дзейнічалі не агульнарасійскія, а асобныя палажэнні і статуты. Школьныя рэформы 1803 г., 1864 г. і земская праводзіліся ў Магілёўскай губерні па асобых палажэннях. Гэта было выклікана тымі вялікімі адрозніваннямі, які мелі беларускія губерні ў параўнанні з велікарускімі, нежаданнем даваць мясцовым элітам, у тым ліку настаўнікам, такія ж правы, як выхадцам з расійскіх рэгіёнаў, жаданнем праводзіць праз сферу адукацыі русіфікацыю краю. Увогуле гэтыя палажэнні стваралі менш спрыяльныя ўмовы і нават абмяжоўвалі магчымасці развіцця адукацыі ў губерні. Сітуацыя пачала мяняцца ў другой палове XIX ст., калі пачалася інкарпарацыя найбольш прэстыжных навучальных устаноў у расійскую прававую прастору. У выніку абмежаванняў Магілёўская губерня, насельніцтва якой пасля далучэння да Расійскай імперыі было адным з самых адукаваных ў краіне, праз стагоддзе страціла свае перадавыя пазіцыі сярод губерняў еўрапейскай частцы імперыі. І толькі калі расійскія ўлады ў 1911 г. далі абмежаныя ў параўнанні з велікарускімі магчымасці самакіравання ў выглядзе земстваў, працэс развіцця школьнай сеткі губерні адразу паскорыўся.

Безумоўна нельга толькі па актах прававога рэгулявання сістэмай адукацыі рабіць вывады аб каланіяльным ці паўкаланіяльным статусе Беларусі ў Расійскай імперыі. Але агульная каланіяльная залежнасць, нераўнапраўе Магілёўскай губерні ў сферы адукацыі не выклікае сумненняў. Каб зрабіць абагульняючыя вывады аб статусе Беларусі і Украіны ў Расійскай імперыі, трэба метадычна і сістэматычна разгледзіць усе сферы грамадскага жыцця, усе грамадскія інстытуты.

**Бібліяграфічны спіс літаратуры:**

1. Агееў, А. Р. Гістарычнае краязнаўства Беларусі (па матэрыялах Магілёўшчыны) : вучэбна-метадычныя матэрыялы / А. Р. Агееў. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. – 124 с. : іл.
2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917г. – Мінск: Народная асвета. 1985г. – 464 с.
3. Жарова, Е.Ю. Універсітэцкія статуты 1803-1804 гг. / Е.Ю. Жарова // Пытанні адукацыі. – 2011. – №4. – С. 268-290.
4. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск: Народная асвета, 1968 г. – 621 с.
5. Науменко, В. В. Очерки истории образования Могилевщины / В. В. Науменко, В. С. Богданов, А. Р. Агеев, под общ. ред. Л. С. Смотрицкого. – Могилев : МГОИРО, 2012. – 504 с. : ил.
6. Опыт описания Могилевской губернии. В 3 кн. Кн.2 – Репринт. Изд. – Могилев: Амелия Принт, 2008. – 1028 с.
7. Парашков, С.А. Адукацыя і асвета Беларусі пасля далучэння яе да Расійскай імперыі (канец XVIII – першая палова XIX ст) / С.А.Парашков/ – Магілёў: МДУ імя А.А. Кулешова, 1998. – 54 с.

Надійшла до редколегії 18.04.2017

A. Aheyeu, канд. іст. наук
Могильовський державний університет імені А.О. Кулешова
(Mahileu, Belarus)

## LEGAL REGULATION OF THE SCHOOL SYSTEM OF MOGILEV GUBERNIYA AS THE REFLECTION OF THE COLONIAL DEPENDENCE OF THE BELARUSIAN LANDS FROM THE RUSSIAN EMPIRE

The article regards the legal regulation of school education in Mogilev Guberniya as a reflection of its colonial status. The analysis of legal documents shows that the activity of educational institutions in Mogilev region in the 19th and early 20th centuries was regulated not by the all-Russian, but with a few exceptions by special statutes. It was caused by major distinctions of Belarusian guberniyas compared to the inner Russian guberniyas, as well as by the reluctance to give local elites the same rights as the representatives of the inner parts of the Empire had, and the governmental desire to carry out Russification of the region by means of education. Legal acts created less favourable conditions and put bounds to the development of education in the guberniya. As a result, one of the most educated guberniyas within a century had lost its leading position among the guberniyas of the European part of the Empire. Only when the Russian authorities finally set up limited local self-governance in the form of the zemstvos, the process of the development of the school network immediately accelerated. Colonial dependence and inequality of Mogilev guberniya in the field of education is not in doubt.

**Key words:** Mogilev Guberniya, Belarus, Ukraine, Russian Empire, colony, colonial outskirts, school, education, legal regulation.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

© Кагамлик С., 2017